# Гуру сучаснай каліграфіі

**У мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» прайшоў майстар-клас пакістанскага мастака і каліграфа Аміра Камаля «Містычная геаметрыя: духоўнае мастацтва ісламскай каліграфіі». Мерапрыемства было арганізавана пры падтрымцы Пасольства Ісламскай Рэспублікі Пакістан у Рэспубліцы Беларусь.**

Амір Камаль ужо даўно працуе ў каліграфіі, з'яўляецца актыўным удзельнікам міжнародных выстаў, тэматычных канферэнцый. Аўтар выказвае свае пачуцці праз каліграфію, а крыніцай натхнення з'яўляецца ісламская гісторыя. Большая частка работ мастака, як паведаміў сам Амір Камаль на майстар-класе, прысвечаны містычнаму руху ў ісламе — суфізму. Яго мэтай з'яўляецца духоўнае выхаванне чалавека, які вызвалены ад паўсядзённай мітусні і змог перасіліць негатыўныя рысы свайго характару. Мастак падкрэсліў, што дадзены кірунак вельмі папулярны і запатрабаваны ў Пакістане і суседніх краінах.

На майстар-класе Амір Камаль пазнаёміў з асноўнымі тэхнікамі і матэрыяламі, з якімі працуе шмат гадоў. Палітру мастака складаюць адценні, характэрныя для традыцыйнай арабскай каліграфіі. Гэта сіні, аранжавы, жоўты, белы, чорны, чырвоны колеры. Амір Камаль часцей за ўсё выкарыстоўвае акрыл, чарніла і тонкае залатое пакрыццё. На майстар-класе аўтар працягнуў работу над карцінай, якую пачаў яшчэ ў Пакістане. Гэты твор адлюстроўвае містычныя танцы дэрвішаў (мусульманскі манах). Такі сюжэт дастаткова часта сустракаецца ў творчасці Аміра Камаля. На карціне ўжо был адлюстраваны сам дэрвіш, мастаку засталося толькі нанесці фінальныя штрыхі ў выглядзе каліграфіі. Наведвальнікі атрымалі магчымасць пазнаёміцца з рэпрадукцыямі ранніх работ майстра, а таксама паспрабаваць паўтарыць за каліграфам.



*Амір Камаль «Дэрвіш, які кружыцца», 2019 г.*

Да таго ж пакістанскі мастак пачаў новы твор. Спачатку Амір Камаль працуе над фонам для асноўнага сюжэта, выкарыстоўвае розныя колеры. «Выбар колеру залежыць толькі ад жадання і эмоцый самога мастака», — дзеліцца з гледачамі Амір Камаль. Для творцы каліграфія — гэта медытацыя, дзе фізічны і маральны стан чалавека імкнецца да гармоніі.

Ахвотным навучыцца мастацтву каліграфіі Амір Камаль прапанаваў свае звычайныя матэрыялы: палатно, пэндзлі і фарбы. Потым крок за крокам мастак паказваў, як стварыць карціну ў стылі ісламскай каліграфіі. Спачатку звычайным простым алоўкам мастак нанёс на паперу эскіз. Яркімі фарбамі зрабіў акцэнт на існуючым малюнку, а рознакаляровыя штрыхі зрабілі фон карціны больш глыбокім. Плаўныя пераходы даюць малюнку аб'ём. Тонкія, але ўпэўненыя рыскі аформіліся ў стройны прыгожы ўзор. Упэўненымі рухамі аўтар стварае шэдэўр на звычайнай паперы. Акрамя фарбаў і алоўка, мастак выкарыстоўвае маркеры, што здаецца вельмі прагрэсіўным элементам у класічным мастацтве.



*Фрагмент з майстар-класа.*

Многіх цікавіць, што пішуць мастакі-каліграфы на сваіх работах? Часцей за ўсё гэта выпадковы набор літар, асабістыя філасофскія разважанні ці пэўныя радкі з Карана. Мастацтва каліграфіі развіваецца з кожным годам, захоўвае старажытныя традыцыі і набывае рысы сучаснасці. Падобныя майстар-класы садзейнічаюць умацаванню культурных сувязей і абмену вопытам паміж мастакамі розных кірункаў.

**Лізавета КРУПЯНЬКОВА,**
**фота аўтара**